## ЛИТЕРАТУРА

1. Горшков М.Н. Российский менталитет в социологическом измерении //Социс. 2008. №6. С.100-114
2. Anderson B. Imagined Communities: Reflections on the Origin and Spread of Nationalism. London, 1983.
3. Гудков Л. Негативная идентичность. - М., 2004.
4. Jasinska-Kania A. Zmieniajace sie identifikacje europejczykow: globalne, europejskie, narodowe, regionalne i lokalne // Globalizacja i co dalej. W-wa, 2004. S.146-162.
5. Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам // http://txt.knihi.com/abdziralovic/
6. Титаренко Л.Г. Национальная идентичность и социокультурные ценности населения в современном белорусском обществе. - Мн., 2006.
7. Pawluczuk W. The Polish-Belarusian Frontier in the Civilization Context //The New Europe: uncertain identity and borders. Bialystok, 2007. C.141-146.
8. Yevarouski V. The West and the Rest: Belarusian perspective / The New Europe: uncertain identity and borders. Bialystok, 2007. C.147-160.
9. Klicperova M., Kovacheva S., Titarenko L. Democratic Citizenship in Comparative Perspective. San Diego, 2003.
10. Лапкин В.В. Модернизация, глобализация, идентичность. Общие проблемы и российские особенности // Полис. 2008. №3. С.50-58.
11. Российская идентичность в социологическом измерении // Полис. 2008. № 3. С.9-28.
12. Терборн Е. Глобализация и неравенство: вопросы концептуализации и объяснения // Социология. 2008. №2.

# ДА ПРАБЛЕМЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫІ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

***І.М.Малашук***
Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, Бабруйскі філіял, г. Бабруйск, Беларусь

Больш чым дзесяцігадовы вопыт самастойнага дзяржаўнага жыцця Беларусі са ўсёй упэўненасцю паказаў, што дзяржава не можа існаваць і паспяхова развівацца без сваёй ідэалогіі. За гэты час грамадскасць краіны ўсвядоміла вострую неабходнасць сістэматычнай працы па фарміраванню і аднаўленню дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь як неабходнай перадумовы ўнутранай стабільнасці, адзінства і росквіту народа. Адначасова ўсталявалася разуменне таго, што ідэйныя каштоўнасці грамадства не ствараюцца штучна і адразу, а выспяваюць у ходзе гістарычнага развіцця народа, вынікаюць з вопыту яго дзяржаўнага і грамадскага жыцця, адлюстроўваюць яго духоўныя каштоўнасці. Таму сёння, ва ўмовах трансфармацыі грамадства, як ніколі раней, адчуваецца неабходнасць пазнання беларусамі сваіх каранёў і першавытокаў. Адным з важнейшых сродкаў асэнсавання гэтага з'яўляецца даследаванне народных звычаяў і абрадаў. Мэтазгодна звярнуць увагу на агульнаславянскія традыцыі, звязаныя з першавобразам сонца, таму што славяне пакланяліся сонцу, абагаўлялі яго і салярны культ з'яўляецца неад'емнай часткай светасузірання далёкіх продкаў.

Сонца, па ўяўленню першабытнага чалавека, было галоўным боствам, таму час яго памірання і ажывання, а разам з тым і ўсёй прыроды пакладзены ў аснову язычніцкіх святаў. Яны групуюцца вакол зімняга і летняга сонцаваротаў, прычым пе-

равага аддаецца зімняму сонцавароту, як часу, калі «замест старога сонца нараджаецца новае, з яго нараджэннем дні пачыналі прыбываць, ночы змяншацца» [1, с.187]. У гэты час, у снежні, сонца паварочвае на лета, пачынае мацней грэць зямлю. Разам з чым ажывае ўся прырода. «Балгары называюць снежань «коложогъ», гэта значыць месяц запальвання сонечнага кола, час, калі нараджаецца сонца» [2, с.212]. Безумоўна, што паводле старажытных уяўленняў самая значная частка жыцця сонца заключалася ў межах першых шасці месяцаў. Веснавы цыкл абрадаў у земляробчых народаў пачынаўся з набліжэння вясны, калі неабходна было рыхтавацца да працы ў полі. У гэты час выконваліся абрады, накіраваныя на тое, каб выгнаць, пахаваць зіму – багіню змроку і смерці – і сустрэць вясну, якая несла святло, цяпло і абуджэнне прыроды. «У рускіх Уладзімірскай губерні ў дзень першага сакавіка было прынята «сустракаць вясну». Для гэтага... прыносяць з лесу сукі, якімі паляць у печы, *каб вясна была цёплая*. У Куйбышаўскім раёне Калужскай губерніі нават быў вядомы асаблівы абрад «грэць вясну», які заключаўся ў запальванні рытуальных вогнішчаў у дзень Сарака мучанікаў ці на Благавешчанне... У шэрагу вёсак вогнішчы, якімі «грэлі вясну», не проста палілі ў полі, але і сплаўлялі, пускалі іх па рацэ.

Больш папулярнымі падобныя формы былі на Карпатах і на ўсходзе Балкан. Так, у румын сербскага Банату ў дзень Сарака мучанікаў жыхары палілі вогнішчы з двух бакоў сяла, пераскоквалі праз іх і крычалі: «Вылазь, цяпло, перамажы зіму». У балгар Банату напярэдадні першага сакавіка і затым яшчэ 12 дзён запар палілі вогнішчы і гаварылі: «*грейми Марта*» (давайце грэць бабу Марту) і прыгаворвалі пры гэтым: «Баб' Марто, я тебе грея днес, ти мене утре!» Баба Марта, сягоння я грэю цябе, а ты мяне заўтра!). У Странджы першага сакавіка жанчыны, імкнучыся пазбавіцца ад шэраню, небяспечнага для дрэў, якія расцвілі, перад узыходам сонца вылівалі на двары кацялок з варам, гаворачы: «Баба Марта да попари сланата!» (Няхай Баба Марта апарыць шэрань!)» [3, с.111].

Саграванню зямлі маглі садзейнічаць і некаторыя рытуальныя дзеянні. У розных мясцовасцях Балгарыі на Благавешчанне, у дзень святога Трыфана і другія веснавыя святы жанчыны выносілі ў сад гарачае вугалле і запальвалі анучы, саграваючы такім чынам зямлю.

Вядома, што на Гомельшчыне вясну пачыналі гукаць яшчэ ў лютым месяцы. Акадэмік Я.Карскі лічыў пачаткам вясны свята Дабравешчання (25 сакавіка па старому стылю) [4, с.251]. Несумненна, што такое меркаванне мела рацыю. У еўрапейскіх народаў у адпаведнасці з хрысціянскім календаром праводзіны зімы ладзіліся перад пастом: у рускіх – гэта масленіца, у заходнееўрапейскіх народаў – карнавал. Найбольшае развіццё масленіца атрымала ў рускіх, у адрозненне ад украінцаў і беларусаў. Неабходна асобна адзначыць адзін з найбольш істотных кампанентаў масленіцы – запальванне вогнішчаў, прычым на высокім месцы – гары, узвышэнні. Высокім імкнуліся зрабіць і вогнішча. Таксама на высокіх месцах запальвалі веснавыя і іванаўскія вогнішчы ўсе еўрапейскія народы. Лічылася, што гэтым магчыма прыблізіць агонь да сонца, злучыць агонь зямлі і неба і паскорыць набліжэнне цяпла. Вогнішчы павінны былі асвяціць як мага большую прастору, прынесці палеткам святло і цяпло. У некаторых месцах у сярэдзіне вогнішча замацоўвалі шост з запаленным колам – сонечным знакам.

Некаторыя даследчыкі выказваюць думку наконт таго, што бліны на масленіцу – знак ажыўшага сонца, але гэта не мае сур'ёзных падстаў, так як гэта рытуальная ежа ўжываецца на пахаваннях і звязана з культам продкаў.

Агні ігралі вялікую ролю ў паўднёвых славян. Балгары, як і рускія, запальвалі вогнішчы на высокім месцы, на краю сяла, галавешкі ж раскідвалі па сялу, думалі, што гэта садзейнічае ўраджаю; сербы, чарнагорцы і харваты вогнішчы і факелы запальвалі пасярод вёскі, праз іх скакалі – «для здароўя», каля іх здзяйснялі трапезу па памёрлых. «Археалагічныя знаходкі таксама пацвярджаюць захаванне рэшткаў салярнага культу. Напрыклад, у Балгарыі каля Варны быў знойдзены некропаль, якому 8 тысяч гадоў. Усе рэчы, раскапаныя там, выключна залатыя, прычым многія звязаны з салярным культам. Знаходжанне іх у месцы захавання памёрлых яшчэ раз пацвярджае, што старажытныя людзі абсалютна верылі ў сваё адраджэнне пасля смерці, як і ў адраджэнне сонца кожную раніцу» [5, с.75]. Здаўна на Беларусі існаваў звычай маліцца кожную раніцу на ўсход.

У некаторых паўночнарускіх рэгіёнах вогнішчы на масленіцу замяняліся першамайскімі вогнішчамі, якімі сустракалі лета (з-за складаных прыродных умоў Поўначы праводзіны зімы пераносіліся на больш позні час, калі вясна ўжо наступіла). Запальванне вогнішчаў звязана са зменай стану сонца, з думкай аб апладняльнай і жыватворнай яго сіле. Майскія вогнішчы павінны былі стымуляваць урадлівасць (аграрная магія).

З пачаткам вясны звязваюцца рэдкія ў славян касмалагічныя павер'і аб штогадовым стварэнні Сусвету. Так лічылася, што сонечны бог, народжаны ў дзень зімовага сонцапавароту, у дзень веснавога раўнадзенства памірае і зноў уваскрасае і ўзносіцца на неба, каб даць сваю моц і новую сілу будучым пладам зямлі. Для міфалогіі ранневясенняга цыклу ў аднолькавай ступені значная і сімволіка пачатку, і сімволіка аднаўлення, якія не заўсёды нават можна правільна размежаваць, бо ўсё залежала ад «паводзін» сонца. З аднаўленнем жыцця і прыроды атрымлівалася, што нібыта аднаўлялася і сонца, яно быццам бы зноў нараджалася пасля зімовага «памірання». Гэты матыў мы ўжо прыгадвалі пры разглядзе каляднага абраду; аднак такі паўтор цалкам апраўданы, таму што ў старажытнасці пачатак года адзначаўся першага сакавіка і, вядома ж, быў звязаны, найперш, са становішчам свяціла на небе. Першавобраз сонца да нашых дзён захаваў многія асаблівасці ад тагачаснага светапогляду продкаў на Сусвет і ролю сонца пры ягоным «зараджэнні».

З тэмай стварэння Сусвету, новага перыяду жыцця, магчыма, і звязана вядомая некаторым славянскім народам магічная працэдура: першага сакавіка (у першы дзень вясны і ў стары Новы год) жанчыны з самай раніцы, калі толькі ўзыходзіць адроджанае сонца, сучаць і прадуць шарсцяную нітку, якая павінна асацыіравацца з ніткай лёсу на пачатку жыцця чалавека. Гэтае кола вераванняў і магічных абрадаў знаходзіць месца і ў папулярным ва ўсходніх і заходніх славян звычаі падвешваць да столі плеценае саламянае ўпрыгожванне, якое называлі «павуком» (паколькі павук нібыта «свет снаваў») ці «кругам» (круг «сонца»).

З міфалагічнай тэмай стварэння / аднаўлення Сусвету звязаны, хутчэй за ўсё, і такі традыцыйны для ранняй вясны звычай, як пабелка жылля чалавекам; у гэтым можна ўбачыць асацыяцыю штогадовага зараджэння «белага свету», які пачынаўся пры актыўным удзеле сонца. Таксама лічылася, што сонца нараджаецца кожную раніцу, а ўвечары памірае. А. Фамінцын адзначае характэрныя рысы старажытнага светапогляду: «Па народнаму ўяўленню сонца раніцай нараджаецца ці загараецца, а ўвечары апускаецца ў мора, на адпачынак: «Устань прабудзіся», - кліча маладзец у сербскай песні, - «родило се сунце»... «Солнце се в море купае», «солнце спочило»,- гавораць галіцкія і ўгорскія русіны. Успомнім уяўленні латышоў аб сонцы, якое кладзецца вечарам у залаты чаўнок, а раніцай, узыходзячы на небе, пакідае на хвалях чаўнок пустым» [6, с.161]. Як сведчаць міфы многіх народаў свету, душы памёрлых, каб трапіць у замагільны свет, павінны былі пераадолець перашкоду ў выглядзе вады. Адпаведна агульнаславянскаму звычаю нябожчыкаў хаваюць да заходу сонца, каб

душы памёршых з яго дапамогай маглі трапіць у іншы свет. «Старажытныя выявы сонечнай лодкі, звязаныя з павер'ямі, якія ўзыходзяць да неалітычнай эпохі, ёсць і ў Егіпце, і ў Скандынавіі» [7, с.51].

У асобных рэгіёнах да ранневеснавых дат прымеркавана, здаецца, тыпова калядная варажба аб жыцці і смерці. І ў аснове таксама ляжыць паміранне і ажыванне сонца. «На Віцебшчыне, напрыклад, традыцыйная калядная варожба з лыжкамі (чыя лыжка за ноч пераверненца, той не дажыве да наступных Каляд) адбываецца ў масленічнае загавенне. У сербаў Алексінацкага Памараўя вечарам на масленіцу члены сям'і, седзячы за сталом, спрабавалі ўбачыць на сцяне ўласны цень: калі цень быў без галавы, то гэта прадказвала ім хуткую смерць» [3, с.139].

Таксама ў кантэксце тэмы вясенняга «новачасу» і адроджанага сонца характэрныя звычаі, якія датычацца распазнавання або варажбы адносна долі – індывідуальнага лёсу чалавека, таго, як ён будзе жыць, паводле традыцыйных прадказанняў, увесь наступны год. Гэтаму прысвечаны «балканаславянскі звычай, аналагічны ўсходнеславянскаму «кусанню каліты» (звычай называўся ламкане, хамкане, ацкане і інш). Гаспадар ці гаспадыня падвешваюць на нітцы хлеб, яйка, халву, яблык, сыр ці штонебудзь іншае, прымацоўваюць нітку другім канцом да сталёвай бэлькі і моцна разгойдваюць яе (нітку – І.М.). Астатнія члены сям'і ... імкнуцца адхапіць сабе кавалачак шчасця ці долі... у балканскіх славян матыў «адкусвання долі» на наступны год звязаны з пачаткам вясны, перыядамі з'яўлення актыўнага сонца» [3, с.139-140].

Яшчэ адным з найбольш распаўсюджаных свят з'яўляецца свята летняга сонцавароту – Іван Купала. Аб яго значэнні сведчыць той факт, што ў Францыі іванаўскае вогнішча запальваў сам кароль. Многія павер'і Іванава дня звязаны з сонцам. У беларусаў і ўкраінцаў існавала павер'е, што ў гэты дзень сонца на ўсходзе іграе – зіхаціць усімі колерамі вясёлкі, скача, хаваецца ў вадзе і зноў з'яўляецца.

Цэнтрам купальскага абрада станавілася ўпрыгожанае дрэва, каля якога «драўняным» агнём, г.з. ад трэння, распальвалі вогнішча. Вогнішчы з'яўляліся зямным падабенствам сонца, таксама служылі і сродкам ачышчэння (праз вогнішчы скакалі, каб ачысціцца перад жнівом). Ужо ў XIX стагоддзі ў некаторых месцах на Украіне сталі скакаць не праз вогнішча, а праз уваткнуты ў зямлю куст ці пук крапівы. Даследчыкі тлумачаць гэту замену тым, што на Украіне царкоўныя ўлады катэгарычна забаранялі купальскія вогнішчы, спасылаючыся на няшчасныя выпадкі пры скаканні праз іх. Аднак крапіва як замена вогнішча з'явілася, відаць, даўно, яна таксама лічылася абярэгам, яе клалі ад ведзьмаў, таму скаканне праз яе было такім жа ачышчальным абрадам, як і скаканне праз агонь. Акрамя вогнішча адным з элементаў сонечнага культу быў і салярны знак – кола, пасаджанае на жэрдку, каб яно высока гарэла. Як трапна зазначыў А.Афанасьеў: «І кола і полымя – сімвалы сонца. Адыходзячы на зіму, яно страчвае свой яркі бляск, становіцца бледным, што і працягваецца да той пары, пакуль са зваротам вясны ні выкупаецца яно ў дажджавой вадзе: толькі тады стане сонца «краснае» і заблішчыць на небе залатым чырвонцам. Паэтычнае ўвасабленне сонца з вогненным колам выклікала звычай запальваць у вядомыя гадавыя святы колы – звычай, што да гэтага часу захоўваецца паміж нямецкімі і славянскімі плямёнамі... У некаторых мясцовасцях Маларосіі існуе звычай, які заключаецца ў тым, што на свята Купалы адкочваюць ад запаленага вогнішча кола, адлюстроўваючы такім сімвалічным знакам паварот сонца на зіму. Тое ж перадавалася і... скочваннем вогненнага кола ў раку: пасля павароту свайго летняе сонца пачынала спускацца з вяршыні нябеснай гары, і гарачыя прамяні яго таксама тушыліся ў дажджавых струменях надыходзячай восені, як полымя спушчанага з гары кола мірала ў хвалях ракі» [1, с.210-212]. Ачышчальным было і купанне, таму што вада ў гэты час мела асаблівую сілу – у гэты дзень сонца нібыта купалася на світанні.

У рускіх не было калектыўных абрадаў і асноўнага элемента купальскага рытуалу – вогнішчаў, існавалі толькі павер'і аб раслінах на Купалу.

Свята Купалы бярэ пачатак ад старажытнага свята Яна. «Ян (Яна) – старажытнейшы культ сонечнага святла, сонца. Першапачаткова яго шанавалі як апекуна цяпла і жыцця. Гэты вобраз і свята былі прынесены ў Еўропу старажытнымі жывёлаводамі-лацінамі з Азіі (у Паўднёва-Усходняй Азіі захаваліся архаічныя вобразы багоў пад назвай «Ян», «Янь» – «гаспадароў» водных крыніц. Старажытнарымскі «Янус» захаваў функцыю стваральніка рэк і ручаёў, падаўцы сонечнага святла. Пад уплывам хрысціянства яго пачалі называць «Іаанам Хрысціцелем» [8, с.209-210]. Старажытныя рымляне святкавалі дзень Януса ў час зімняга сонцавароту (і ад яго крыху пазней быў названы месяц «январь»). Сучасныя італьянцы здзяйсняюць абрад у гонар Януса ў час летняга сонцастаяння – 24 чэрвеня, аднак называюць гэта свята Іаанам Хрысціцелем. Адсюль вынікае, што архаічны Ян (Янус) святкаваўся старажытнымі жывёлаводамі двойчы на год – на летняе і зімняе сонцастаянне, славяне запазычылі толькі летняе свята Яна (24 чэрвеня), які быў у большай ступені звязаны з земляробствам, аб чым сведчаць абрады падскоквання «на доўгі лён» (у чэхаў і славакаў), абыход ворыўнай зямлі з плугам, ужыванне абрадавай ежы з ячменнага зерня. Старажытныя славяне, што жылі на Дунаі – радзіме праславян - побач з лацінамі, захавалі архаічную назву свяшчэннага вобраза – Ян. Нават пасля рассялення гэта назва захавалася ў чэхаў, славакаў, палякаў і лужычан. Ва ўсходніх славян свята называлася «Іван», аднак у абрадавых купальскіх песнях часта выконваўся прыпеў – канцоўка: «Яна, Яна, Яна». У палякаў і ўсходніх славян захаваўся найбольш архаічны звычай пасля купальскай ночы ўзбірацца на пагоркі і адтуль глядзець на ўзыходзячае сонца і на яго «ігру», славячы штогадовы прыход нябеснага свяціла.

Разам з Купаллем успрымаўся як адзіны святочны цыкл Пятроў дзень, чыя абраднасць блізкая да купальскай. Асноўны пятроўскі абрад – «пільнаваць сонца». Грукат, шум, крыкі – старажытныя прыёмы адпугвання нечысці – асноўны змест звычаю «пільнаваць сонца». Можна сцвярджаць, што Купала і Пятроў дзень паходзяць з адной крыніцы, магчыма, са свята ў гонар Ярылы – бога сонца, падаўцы жыцця і пладаводства. Яго ўяўлялі на тэрыторыі Беларусі як маладога, прывабнага юнака, які ездзіць у белым плашчы, на галаве вянок, у руках – каласы, ногі босыя.

Паколькі сёння, ва ўмовах трансфармацыі грамадства, для беларусаў прыярытэтнымі з'яўляюцца такія каштоўнасці, як дзяржаўнасць, мова, уласная гісторыя, нацыянальныя традыцыі, звычаі, знаёмства з духоўнай спадчынай садзейнічае фарміраванню ўяўленняў аб месцы і ролі народа ў сусветным гістарычным працэсе, станаўленні яго этнічных, а затым і нацыянальна-культурных асаблівасцей у кантэксце развіцця сусветнай цывілізацыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу: В 3 т. – М.: «Индрик», 1994-1995. – Т. 1-3.
2. Афанасьев А.Н. Происхождение мифа. Статьи по фольклору, этнографии и мифологии. – М.: «Индрик», 1996. – 638 с.
3. Агапкина Т.А. Мифологические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. – М., 2002. –816 с.
4. Карскі Я. Беларусы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
5. Казакова І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору). – Мінск: «БОФФ», 1999. – 221 с.
6. Фаминцын А.С. Божества древних славян. – С.-П.: Алетейя, 1995. – 240 с.
7. Голан А. Миф и символ. – М., Иерусалим: Тарбут, Русслит, 1994. – 375 с.
8. Мифологический словарь / М.Н. Ботвинник, М.А. Коган, М.Б. Рабинович, Б.П. Селецкий. – Минск: Университетское, 1989. – 255 с.